пранікнення ў стылявую сістэму сучаснай гарманічнай мовы шляхам дасачынення па дадзенаму ўзору перыядаў ці іншых формаў з характэрнымі рысамі акордыкі і танальнасці.

Асноўнай формай работы пры азнаямленні з сучаснай музыкай з'яўляецца гарманічны аналіз. У якасці прыкладаў для аналізу неабходна выкарыстоўваць і творы беларускіх аўтараў (напрыклад, «Ціль Уленшпігель» Глебава як узор ужывання сіметрычных ладоў і мажора-мінорнай сістэмы, «Попел», «Капрычос» Картэса пры знаемстве з серыйнай тэхнікай і г.д.). Гэта не толькі значна пашырае веды студэнтаў аб сучаснай беларускай музыцы, але і дапамагае ўспрыманню беларускай музычнай культуры як часткі сусветнай культуры, у многім сугучнай агульнаму працэсу развіцця выразных сродкаў (у тым ліку гармоніі) у музыцы XX стагоддзя.

Клімовіч Л.А.,
аспірантка

## АСАБЛІВАСЦІ ВУЧЭБНА-ТВОРЧАЙ РАБОТЫ Ў ДЗІЦЯЧЫМ ХОРЫ

Вучэбна-творчая работа ў дзіцячым хоры мае свае спецыфічныя асаблівасці ў параўнанні з работай у хоры для дарослых. Гэта спецыфіка абумоўлена перш за ўсе тым, што дзіцячы арганізм у адрозненне ад дарослага знаходзіцца у бесперапынным развіцці і змяненні. Так, дзеці ва ўзросце дзевяці гадоў фізічна больш моцныя і дужыя, чым дзеці 7-8 гадоў. Хуткі фізічны рост характарызуецца імкненнем да руху, таму дзеці становяцца больш непаседлівымі. Розняцца дзеці і ў разумовым развіцці. У трэцім класе дыферэнцыяцыя дзяцей па інтарэсах становіцца больш відавочнай, чым у першым і другім класах. У гэтым узросце ў дзяцей з'яўляецца імкненне «вылучыць сябе». Гэта імкненне неабходна правільна накіраваць. Педагогу трэба добра ведаць індывідуальныя рысы выхаванцаў і праводзіць вучэбна-творчую работу ў адпаведнасці з псіхафізічнымі асаблівасцямі дзяцей розных па ўзросту груп.

Ствараючы дзіцячы хор, неабходна прытрымлівацца аднароднасці складу калектыву па ўзросту. Найбольшы вынік дае работа з такім хорам, які развіваецца на працягу рэгулярных заняткаў, пачынаючы з малодшага ўзросту і да старэйшага. Прайшоўшы такую школу харавых спеваў, дзеці на ўсе жыццё захоўваюць любоў да іх і працягваюць заняткі ў гэтым напрамку.

Пасля вывучэння літаратуры па дадзенаму пытанню і вопыту работы з дзецьмі вядомых майстраў быў арганізаваны дзіцячы харавы калектыў «Вясёлка» з двух трэціх класаў у сярэдняй школе N 17 з музычна-харавым ухілам г.Брэста. У ім займаецца 50 чалавек, сярэдні ўзрост дзяцей - 9 гадоў. Заняткі праводзяцца сістэматычна два разы ў тыдзень на працягу двух гадоў.

На першым годзе навучання асаблівая ўвага ўдзялялася развіццю вакальна-харавых навыкаў пры рабоце над аднагалоссем, у другі год работа была сканцэнтравана над двухгалоссем.

У пачатку навучання мы выявілі недасканала інтанаваных дзяцей, з якімі праводзіліся індывідуальныя заняткі.

Як вядома, асновай харавых спеваў з'яўляецца вакальна-харавая тэхніка. Ад заняткаў да заняткаў работа па яе развіццю ўскладнялася, рабілася больш разнастайнай і цікавай. Асноўны змест работы над развіццем вакальных навыкаў прадугледжваў наступнае: а) правільнае дыханне, б) гукаўтварэнне, в) правільную дыкцыю і артыкуляцыю, развіццё харавых навыкаў у рабоце над інтанацыяй, строем і ансамблем.

Кіраўніку хору дзяцей малодшага ўзросту неабходна памятаць, што музычную падрыхтоўку не варта зводзіць да аднаго толькі вывучэння нот і дакладнага інтанавання. Дзяцей патрэбна навучаць слухаць і выконваць музычныя творы, удумліва ўслухоўвацца ў вобразы. Іншымі словамі, неабходна дабіцца творчай актыўнасці кожнага навучэнца. Лепшы спосаб для гэтага - гульня. Напрыклад, вядома, што для фарміравання вакальных навыкаў неабходна сістэматычна выкарыстоўваць вакальныя практыкаванні. Каб зрабіць гэту работу больш цікавай, можна прапанаваць дзецям гульню пад назвай «У лесе». Досыць папрасіць іх уявіць, што яны заблудзіліся ў лесе. «Як вы будзеце клікаць адзін аднаго?» - пытаецца настаўнік. Дзеці адразу адказваюць: «Ау!» Педагог прапануе ім гэта праспяваць. Пытаннямі: «Якія птушкі сустракаюцца ў лесе?», «Як яны спяваюць?» - ён накіроўвае дзяцей на думку, што яны самі могуць складаць практыкаванні. Можна паказаць ім, як вар'іраваць рытм, інтанацыю. Праца над практыкаваннямі, якія складаюць самі дзеці, садзейнічае развіццю іх творчай фантазіі.

Пякуцька А.В.,
дацэнт,
Мухортава А.Я.,
суіскальнік

## ДУХОЎНАЯ ХАРАВАЯ МУЗЫКА Ў ЗМЕСЦЕ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ

Пеўчая харавая справа - гэта не вузкаспецыяльная праблема музыкантаў-прафесіяналаў,

гэта пытанне, якое датычыцца духоўнай культуры народа, яго эстэтыкі, маральнасці; гэта самы просты і дзейсны рычаг выхавання, самы кароткі шлях у свет мастацтва. Гэта форма творчасці, якая садзейнічае спалучэнню асабістых імкненняў з інтарэсамі калектыву. Страты ў эстэтычным, музычным выхаванні павярочваюцца пазней стратамі ў навуковай, вытворчай і эканамічнай галінах, усюды, дзе патрабуюцца развіты творчы розум, творчая фантазія.

У апошні час шмат увагі ўдзяляецца духоўнай музыцы - адной з асноў развіцця харавога мастацтва. Гэта частка культуры, дзе выяўляецца такая нябачная матэрыя, як душа чалавека. Духоўная музыка ўяўляе сабой вялікае багацце. Ад Бартнянскага і да Рахманінава няма ніводнага значнага кампазітара, які б не дакрануўся да гэтага вытоку. Духоўныя творы Чайкоўскага, Рахманінава, Грачанінава, Кастальскага - сусветна прызнаныя вяршыні музычнай класікі. Ці магчыма, каб чалавецтва перастала мець патрэбу ў найвялікшых творах Ласо, Мантэвэрдзі, Баха, Гендэля, Бартнянскага, Гайдна, Моцарта, Глінкі, Мусаргскага, Брамса, Вэрдзі, Чайкоўскага, Рахманінава, Брытэна, Стравінскага, Шастаковіча?

Сёння ў рэпертуары прафесійных хароў усе часцей з'яўляецца духоўная музыка розных эпох і стыляў: старадаўнія знаменныя песнапенні, канцэрты рускага барока і класіцызму, манастырскія напевы мінулага стагоддзя, творы рускіх і замежных класікаў і кампазітараў нашага стагоддзя.

Для выканання такой музыкі спевакі-харысты павінны валодаць той «здольнасцю ўспрымання», якая неабходна для спасціжэння твора мастацтва з далейшым данясеннем яго да слухача.

Старажытныя духоўныя песнапенні адрозніваюцца павольным тэмпам, раўнамерным рытмам, плаўнасцю, шырокім дыханнем меладычнай лініі. Адным з важнейшых патрабаванняў да духоўных песнапенняў з'яўляецца выразнае вымаўленне слоў. Усе гэтыя якасці, уласцівыя духоўным песнапенням, дапамагаюць выпрацоўваць у спевакоў-харыстаў валоданне шрукім дыханнем, а ўнутрыскладовае распяванне прывівае навыкі вакалізацыі. Апора на прымарныя тоны голасу, спевы ва унісон на працяглым дыханні з вытрымліваннем гуку ў вызначанай дынаміцы забяспечваюць адзіную манеру, чысціню строю і злітнасць харавога ансамбля.

Уключэнне ў рэпертуар харавога калектыву духоўных твораў дае магчымасць весці работу па ўдасканаленню вакальна-харавых і дырыжорскіх навыкаў, выканаўчага майстэрства. Уключэнне ў рэпертуар духоўных твораў уплывае на манеру спеваў і спеўную тэхніку, на ўвагу да прыемаў гукавядзення, да выразнай афарбоўкі гуку, да яснага і асэнсаванага вымаўлення слова.

Вывучэнне духоўнай музычнай спадчыны - неабходная частка выхавання харавога дзеяча. У вытоках музыкі студэнт можа знайсці матэрыял для ўдасканалення сваёй кваліфікацыйнай падрыхтоўкі і для задавальнення творчага інтарэсу.

З мэтай аднаўлення і адраджэння духоўнай харавой спадчыны і ўдасканалення методыкі навучання і выхавання студэнтаў прапануем уключаць у рэпертуар харавых калектываў навучальных устаноў духоўныя творы беларускіх кампазітараў, класікаў рускай і замежнай харавой музыкі.

Крапівіна Т.Т.,
ст.выкладчык

## РАЗВІЦЦЁ ВОБРАЗНАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ФАРТЭПІЯНА

Разуменне музыкі, як і любога іншага віду мастацтва, патрабуе ад чалавека пэўнага эстэтычнага вопыту, у сваю чаргу садзейнічаючы яго ўзбагачэнню. Навучанне музыцы неабходна для культурнага чалавека, як навучанне мове, матэматыцы, гісторыі і іншым навукам.

Ці рыхтуем мы студэнтаў да разумення музыкі? Ці вучым правільна ўвасабляць мастацкі вобраз музычнага твора? Мастацкі вобраз музычнага твора - гэта сама музыка, жывая гукавая матэрыя, музычная мова з яе заканамернасцямі і састаўнымі часткамі, якія названы мелодыяй, гармоніяй, паліфаніяй і інш.

Асаблівая роля ў навучанні музыцы належыць фартэпіяна. Асноўныя звёны фартэпіяннай ігры - гэта гук, рытм і розныя віды тэхнікі.

Каб дасягнуць поспехаў у рабоце над мастацкім вобразам, трэба бесперапынна развіваць студэнта музычна, інтэлектуальна, артыстычна, а значыць, і піяністычна. Для гэтага неабходна развіваць яго слыхавыя даныя, знаёміць з музычнай літаратурай; вучыць разбірацца ў форме, тэматычным матэрыяле, гарманічнай і паліфанічнай структуры выконваемага твора; развіваць фантазію, выкарыстоўваючы метафары, паэтычныя вобразы, аналогіі са з'явамі жыцця прыроды і чалавека. Трэба таксама навучыць тлумачыць музычную мову твора, адначасова з развіццём любові да музыкі развіваць у студэнта любоў да іншых відаў мастацтва: паэзіі, жывапісу, архітэктуры і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ